Viestki541.qxd 2/27/2011 10:23 PM Page 1 (3,1)


# Весткі й Паведамленьні

**Нью-Ёрскага аддзелу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня**

**Viestki j Paviedamlenni**

**№ 3 (541)**
**Сакавік 2011 г.**



*Belarusan American Association, Inc.*
*P. O. Box 572, New York, NY 10113-0572*

Сусьветнае сеціва: *www.baza-belarus.org*


# Акцыя ў падтрымку палітвязьняў




У Нью-Ёрку 19 лютага, роўна праз два месяцы пасьля жудасных падзеяў у сталіцы Беларусі, прайшла акцыя ў падтрымку палітвязьняў. Каля паўсотні сяброў Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА, Беларускага Маладзёвага Руху Амэрыкі ды проста неабякавых да будучыні Беларусі людзей, нягледзячы на халоднае надвор'е і моцны вецер, сабраліся насупраць будынка ААН, каб сумесна падтрымаць беларусаў, якія перасьледуюцца на Радзіме. У мітынгу ўзялі ўдзел беларусы з штатаў Нью-Ёрк, Нью-Джэрзі, Мэйн, Масачусэтс ды Пэнсыльванія.

Акцыя пачалася сьпяваньнем беларускага нацыянальнага гімну "Мы выйдзем шчыльнымі радамі" і выступам сп. Яўгена Барысевіча. Ён паведаміў, што падобныя акцыі адбываліся у той дзень ня толькі ў Беларусі, але і ў іншых кутках сьвету: у Нідэрляндах каля будынка Міжнароднага крымінальнага суду ў Гаазе, у Лёндане перад беларускаю амбасадаю, у Ванкувэры.

Яўген узгадаў імены тых, хто ўжо два месяцы знаходзіцца за кратамі, ці супраць каго заведзеныя крымінальныя справы: Андрэй Саньнікаў, Алесь Міхалевіч, Мікола Статкевіч, Павел Севярынец, Анатоль Лябедзька, Зьміцер Дашкевіч, Наста Палажанка, Ірына Халіп, Аляксандар Класкоўскі, Зьміцер Бандарэнка, Натальля Радзіна, Аляксандар Атрошчанкаў, Сяргей Вазьняк, Аляксандар Фядута, Андрэй Дзьмітрыеў, Алесь Кіркевіч, Уладзімер Кобец, Алег Корбан, Мікіта Ліхавід, Уладзімер Лобан, два грамадзяніна Расеі Арцём Брэўс і Іван Гапонаў ды яшчэ каля двух дзясяткаў чалавек. Удзельнікі акцыі трымалі партрэты зьняволеных у Беларусі.

Узгадаў сп. Барысевіч таксама пра Мікалая Аўтуховіча, які знаходзіцца па надуманых абвінавачаньнях за кратамі за свае палітычныя погляды ўжо другі раз. Але нават у беларускіх мэдыяхягонае імя сёньня ўзгадваецца вельмі рэдка.

Людзі зьнішчаюцца рэжымам цягам ўсяго тэрміну кіраваньня Лукашэнкі: зьніклі бязь вестак палітыкі Юры Захаранка і Віктар Ганчар, бізнэсмэн Анатоль Красоўскі, журналіст Дзьмітры Завадзкі, памёр пры загадкавых абставінах Генадзь Карпенка, былі забітыя журналісты Вераніка Чаркасава і Васіль Гроднікаў...

Яўген заклікаў не забывацца і падтрымліваць тых, хто не баіцца ўзьняць свой голас і дамагацца лепшага жыцьця ды бараніць волевыяўленьне народу. А выказаць сваё стаўленьне да кіруючага рэжыму ды да таго, што адбываецца ў краіне ў апошнія 16 гадоў, на галоўныя вуліцы беларускай сталіцы выйшлі каля 50 тысяч чалавек. Сотні зь іх былі затрыманыя, зьбітыя, асуджаныя, пакараныя адміністратыўна. Больш за чатыры дзясяткі чалавек знаходзяцца зараз пад крымінальным перасьледам і ім пагражае да 15-ці гадоў пазбаўленьня волі. За два дні да акцыі ў Нью-Ёрку ў Менску быў вынесены першы пасьлявыбарчы крымінальны прысуд. На чатыры гады калёніі строгага рэжыму быў асуджаны актывіст кампаніі "Гавары праўду!" 28-гадовы Васіль Парфянкоў.

Затым слова ўзяла сп-ня Валянціна Якімовіч. Яна адзначыла, што бярэ падзеі ў Беларусі вельмі блізка да сэрца: "Асабліва прыгнятаюць навіны аб тым, што людзей, каго ведаю асабіста, падтрымоўваю сувязь, арыштоўваюць, кідаюць за краты і абвінавачваюць у дзяржаўным перавароце. А за іхнюю дзейнасьць на карысьць Беларусі ім пагражае паўтары дзесяткі гадоў пазбаўленьня волі. Гэта жахліва..."

Кароткую зьмястоўную прамову зрабіў сп. Мікола Сагановіч. Ён гаварыў аб

*Заканчэньне на бачыне 4*

# Лютаўскі сход Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА

У суботу, 12 лютага, у "Доме маракоў" на Мангэтане прайшоў чарговы сход Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА. Напачатку сходу старшыня аддзелу Віталь Зайка коратка спыніўся на падзеях у Беларусі й у Амэрыцы за апошні месяц. Ён узгадаў, між іншага, працяг перасьледу ўдзельнікаў падзеяў 19 сьнежня 2010 г. у Беларусі, узнаўленьне і пашырэньне санкцыяў Эўразьвязу і ЗША супраць рэжыму Лукашэнкі і акцыю пратэсту супраць рэпрэсіяў у Беларусі, што адбылася ў Нью-Ёрку 19 студзеня каля прадстаўніцтва Беларусі ў Аб'еднаных Нацыях.

Затым перад прысутнымі з сваім аналізам падзеяў у Беларусі за апошні час выступіў Старшыня Беларускага Народнага Фронту Зянон Пазьняк. У сваім выступе сп. Пазьняк распавёў пра пэрыяд падрыхтоўкі да прэзыдэнцкіх выбараў 2010 г. і даў аналіз раскладу сілаў і кандыдатаў у прэзыдэнты, якія былі допушчаныя да выбараў. "Ад самага пачатку было ясна, што ўся гульня Лукашэнкі ў дэмакратыю была скіраваная толькі на адно – легітымізацыю рэжыму. У сутыкненьні двух геапалітычных сілаў выйшла так, што менавіта гэта задавальняла абодвыя бакі. І аб гэтым недвухсэнсоўна было паведамлена Лукашэнку прадстаўнікамі Эўразьвязу, міністрамі замежных справаў Польшчы й Нямеччыны. Увосень перад выбарамі Р. Сікорскі й Г. Вэстэрвэле адкрытым тэкстам далі зразумець рэжыму, што калі будзе "прагрэс", і выбары пройдуць без эксцэсаў, з бачнасьцю дэмакратыі й празрыстасьці, Беларусь чакае вялікі пернік у выглядзе 3 млд. эўра ад Эўразьвязу. Безумоўна, яны добра ўяўлялі сабе, што ніякай сапраўднай выбарчай працэдуры ня будзе, што усё загадзя падрыхтаванае для фальсыфікацыяў пад ліпавую перамогу Лукашэнкі. Але хацелі паказаць, што іх задаволіць бачнасьць "праргрэсу". Прытым заўсёды было ясна, што Лукашэнка ніколі ня пойдзе на тое, што патрабуе Эўропа, на рэфармаваньне, зьмены – бо гэта вядзе да клясы самастойных грамадзянаў, да свабодных людзей. А сапраўды свабодныя людзі не прымірацца з дыктатураю – і Лукашэнка, разумеючы гэта, абдурыў Эўразьвяз.

Мы заўсёды працавалі на байкот такіх ліпавых працэдураў, што ня маюць ніякага дачыненьня да сапраўднага выбарчага мэханізму. Рэжым зацікаўлены, каб людзі ішлі на выбары. Яму дастаткова толькі гэтага, каб было што перакручваць і "даводзіць да кандыцыі". Усё астатняе будзе далей зроблена праз фальсыфікацыю. Таму рэжым баіцца байкоту і ўсяк спрабуе завабіць на выбары як электарат, так і недальнабачных палітыкаў зь лягеру апазыцыі, памерах дапамогі арыштаваным і пацярпелым ад рэпрэсіяў. Салідарнасьць, якой яшчэ не было. Рэжым не чакаў гэтага, разгубіўся. Таму – імпульс ёсьць. Ствараюцца новыя суполкі. Ідзе праца.



што яму і ўдаецца зрабіць. Але праца па тлумачэньні мэтаў байкоту дае эфэкт. Вынік байкоту праявіўся на парляманцкіх выбарах 2008 году. Былі зафіксаваныя цынічныя парушэньні, хлусьлівая лукашэнкава "бухгалтэрыя", і ў выніку законнасьць зьлепленай праз фальшаваньне "палаткі" не была прызнаная міжнароднай супольнасьцю."

Далей прамоўца спыніўся на перадгісторыі грамадзкага руху "Гавары Праўду" і адзначыў небясьпечную для лёсаў заангажаваных ў яго людзей сытуацыю. "Зь Някляева хацелі зрабіць рытуальнага казла, якога рыхтавалі да закланьня. Яшчэ зь верасьня вялася агітацыя "За Плошчу". Але Лукашэнка перахапіў ініцыятыву, даў магчымасьць удзельнічаць у выбарах усім, хто заявіўся кандыдатам, цынічна заяўляў, каб дапамаглі ім сабраць подпісы. Тымчасам ў Менск бліжэй да выбараў сьцягнулі АМОН, войскі. Папярэджвалі, што на Плошчы будуць выбухі, будуць узарваныя гранаты. Усё ішло да таго, каб зрабіць правакацыю, зьнішчыць волю да супраціву, запалохаць. І зрабілі."

Разам з тым, падкрэсьліў сп. Пазьняк, ня трэба ўпадаць у пэсымізм. "Station ноўчае ў гэтай невясёлай сытуацыі тое, што гэтыя жудасьці, гэтая "крывавая нядзеля" моцна ўскалыхнулі грамадзтва. І гэта відаць па беспрэцэдэнтных

Гэтае абуджэньне дойдзе да лягічнае мэты – пазбаўленьня ад дыктатуры".

Зь нефармальнай гутаркай перад прысутнымі выступіў старшыня аддзелу БАЗА ў Нью-Джэрзі Юрка Азарка. Ён распавёў пра сябе, пра дзейнасьць свайго аддзелу і пра беларусаў у штаце Нью-Джэрзі. Сп. Азарка падрабязней спыніўся на гісторыі Арганізацыі Беларуска-Амэрыканскай Моладзі (АБАМ), кіраўніком якое ён быў. АБАМ існавала да пачатку 1990-х гадоў, выдавала свой 2-моўны часапіс, мела свой танцавальны гурток "Васілёк", які прыязджаў з канцэртамі ў Беларусь – на Беласточчыну і ў Менск. Сп. Азарка таксама распавёў пра традыцыйныя Сустрэчы Беларусаў Паўночнай Амэрыкі і штогадовыя нацыянальныя сьвяткаваньні, якія традыцыйна ладзіць БАЗА.

На сходзе прагучала паведамленьне пра так званы "надзвычайны кангрэс БАЗА", які меўся адбыцца 13-га лютага, і было адзначана, што ні правядзеньне "кангрэсу", ні ягоныя мажлівыя вынікі ня могуць быць законнымі дзеля нявырашаных пытаньняў, хібаў і парушэньняў, праз якія ўтварылася ўправа, што залатвяе свой нелегальны статус праз неправамоцны "кангрэс".

Напрыканцы сходу у разьдзеле "Рознае" прагучэлі аб'явы й інфармацыі, адбылося знаёмства з гасьцямі аддзелу.

**Віталь ЗАЙКА**

Viestki541.qxd 2/27/2011 10:24 PM Page 3 (3,1)



# Барыс ДАНІЛЮК (1923-2011)



28 студзеня адыйшоў у вечнасьць сьв. пам. Барыс Данілюк, выдатны царкоўны і грамадзкі дзеяч беларускай грамады ў Амэрыцы, колішні сябар БАЗА.

Барыс Данілюк нарадзіўся ў в. Старыя Дзявяткавічы каля Слоніму ў сям'і сьвятара, удзельніка Слуцкага Збройнага Чыну Хведара Данілюка. Вучыўся ў пачатковай школе ў Слоніме, затым – у польскіх гімназіях у Баранавічах і Слоніме. З прыходам Саветаў пакінуў навуку ў дзесяцігодцы і пачаў дапамагаць бацьку на гаспадарцы.

З пачаткам Другой сусьветнай вайны працаваў сакратаром і школьным інспэктарам у Слоніме. Затым працаваў у Беларускай Самапомачы, кіраваў мастацкай самадзейнасьцю, быў спартовым інструктарам Саюзу Беларускай Моладзі (СБМ). Барыс Данілюк быў удзельнікам Другога Ўсебеларускага Кангрэсу ў Менску ў 1944 г.

У лістападзе 1943 г. ажаніўся з Марыяй Дземідовіч.

У ліпені 1944 г. разам зь сям'ёю выехаў у Нямеччыну. У дарозе нарадзіўся сын. З дапамогаю прадстаўніцтва БЦР у Бэрліне перабраўся зь сям'ёю і бацькамі ў Вюртэмбэрг.

Па вайне вучыўся на інжынэра-будаўніка ва ўніверсітэце ЮНРРА ў Мюнхэне, быў сябрам Беларускага Студэнцкага Згуртаваньня і ўваходзіў у рэдкалегію часапісу "Крывіцкі Сьветач". Браў удзел у Зьезде беларускіх студэнтаў у Марбургу ў 1947 г. Сябра Рады БНР у Остэргофэне, дапамагаў а. С. Войтанку даглядаць парафію БАПЦ у Ды-Пі-лягеры Мюнсінген. Браў удзел у аднаўленьні БАПЦ у чэрвені 1948 г. на Саборы ў Канстанцы.

З дапамогаю Янкі Станкевіча перабраўся ў 1950 г. ў Амэрыку, дзе браў актыўны ўдзел у арганізацыі беларускага царкоўнага і грамадзкага жыцьця, перш з моладзьдзю і ў мастацкай самадзейнасьці, быў культурніцкім рэфэрэнтам управы БАЗА, у царкоўным хоры. Пазьней уваходзіў у Раду і Кансісторыю БАПЦ, быў сакратаром царкоўнае рады сабору сьв. К. Тураўскага ў Брукліне, кіраваў там царкоўным хорам.

Быў рэдактарам і выдаўцом часапісу "Царкоўны Пасланец" і бюлетэню "Навіны з Роднае Сьвятыні". Займаўся вершаванымі перакладамі, аўтар некалькіх вершаваных зборнікаў і апублікаваных у "Запісах БІНіМ" успамінаў. Шмат зрабіў для дапамогі новаму пакаленьню эмігрантаў зь Беларусі, пачынаючы ад сярэдзіны 1990-х гадоў.

Нью-Ёрскі аддзел БАЗА выказвае спачуваньні сям'і й сябрам нябожчыка.

**Віталь ЗАЙКА**

# Уладзімер НАБАГЕЗ (1919-2011)



11 студзеня пайшоў з жыцьця беларускі грамадзкі дзеяч, шматгадовы актыўны сябар БАЗА і Рады БНР доктар мэдыцыны сьв. пам. Уладзімер Набагез.

Ураджэнец в. Сялец на Наваградчыне, ён скончыў беларускую гімназію ў Наваградку, у якой вучыўся разам з Барысом. Рагулем, Язэпам Сажычам. Перад вайною скончыў падафіцэрскую школу. Напачатку Другой сусьветнай вайны, як жаўнер польскага войска, трапіў на поўначы Польшчы у нямецкі палон, працаваў на баўэра пад Кёнігсбэргам.

З дапамогаю Беларускага прадстаўніцтва ў Бэрліне выйшаў на волю ў 1941 г., браў удзел у працы беларускіх арганізацыяў у Данцыгу. Уваходзіў у склад Беларускай Незалежніцкай Партыі.

Пасьля вайны вучыўся на лекара ў Марбурскім унівэрсытэце, быў адным з арганізатараў Беларускага Студэнцкага Згуртаваньня. Потым працягнуў вучобу ў Лювэнскім унівэрсытэце ў Бэльгіі, дзякуючы стыпэндыям, здабытым пры дапамозе тагачаснага Старшыні Рады БНР Міколы Абрамчыка. Па атрыманьні дыплёму лекара працаваў у Бэльгіі.

У 1956 годзе Уладзімер Набагез пераехаў у ЗША. Спачатку працаваў фізычна на розных працах, затым уладкаваўся па спэцыяльнасьці, лекарам у нью-ёрскім шпіталі, а потым на прыватнай практыцы ў горадзе Ўолдэн, штат Нью-Ёрк.

У Злучаных Штатах др. Набагез пазнаёміўся і ажаніўся з канадыйкаю французкага паходжаньня Ёландаю. У шлюбе нарадзілася двае сыноў - Янка і Андрэй.

У ЗША др.Набагез адразу актыўна далучыўся да беларускай грамадзкай працы. У 1964-1968 гг. быў старшынём Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА. Браў удзел у дапамозе пацярпелым ад Чарнобыльскай аварыі ў Беларусі, шчодра ахвяраваў на розныя грамадзкія беларускія справы.

Нью-Ёрскі аддзел БАЗА выказвае спачуваньні сям'і й сябрам нябожчыка.

**Віталь ЗАЙКА**

**Абʼяўляецца збор сродкаў на выданьне новай кнігі "Толькі б яўрэі былі" славутага беларускага паэта і перакладчыка Рыгора БАРАДУЛІНА.**

Кніга будзе складацца з трох частак:

1. "Стваральнікі высокае красы" (сюды ўвойдуць артыкулы Р. Барадуліна пра М. Шагала, І. Харыка, Р. Рэлеса, Х. Мальцінскага, З. Азгура, Р. Бярозкіна, Н. Кісьліка, Д. Сімановіча і Б. Заборава.
2. "Галасы неўміручага хору" (пераклады твораў Бяліка, Гольдфадэна, Швэдзіка, Рэйзіна, Сары Каган, Талалая, Кацнэльсона, Барсука, Платнэра, Шагала, Гардона, Мальцінскага, Рэлеса)
3. "Паплечнікам па духу, сябрам па жыцці" (вершы, прысьвечаныя З. Азгуру, Р. Бярозкіну, М. Герчыку, У. Ідэльсону, Б. Збораву, Н. Кісьліку, Р. Нікіфаровічу, А. Рабкіну, Р. Рэлесу, Я. і М. Серперам, М. Шагалу).

Сродкі можна дасылаць чэкам на адрас Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА: ***P. O. Box 572, New York, NY 10113***.

Чэкі выпісвайце на ***Belarusan American Association*** з адзнакаю *"кніга Р. Барадуліна"*).

## БЕЛАРУСКА-АМЭРЫКАНСКАЕ ЗАДЗІНОЧАНЬНЕ

**мае гонар запрасіць на ўрачыстую акадэмію, банкет і канцэрт, прысьвечаныя 93-м угодкам абвешчаньня незалежнасьці**

## БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ,

якія адбудуцца ў нядзелю, **27 сакавіка 2011 году** а **12:30** гадзіне папаўдні ў гатэлі **Hyatt Regency**, які месьціцца па адрасу:

***2 Albany Street, New Brunswick, New Jersey 08901*.**

Перад імпрэзаю а 10:00 адбудзецца набажэнства ў царкве сьв. Маці Божае Жыровіцкае БАПЦ па адрасу: ***9 River Road, Highland Park, New Jersey 08904*.**

Квіткі па замове: **$50** дарослым, **$30** студэнтам.

Квіткі пры дзьвярах: **$60** дарослым, **$40** студэнтам.

Просім замовіць квіткі да 15 сакавіка 2011 году, даслаўшы аплату на адрас:

***Ms. Luda Bakunovich, 37 Sand Hill Road, Kendall Park, NJ 08824.***

Чэкі выпісвайце на: ***Belarusan American Association***, пазначыўшы: “**tickets**”.

Па дадатковую інфармацыі тэлефануйце **сп. Юрку Азарку *(732)560-8610*.**

*Даезд да месца сьвяткаваньня зь Нью-Ёрку аўтобусам ад **NY-NJ Port Authority Bus Terminal** (8th Ave at 41 St., New York, NY 10001) да гораду **New Brunswick**, прыпынак **Hyatt Regency**, ля самога гатэлю. Аўтобус адыходзіць кожныя паўгадзіны. Час у дарозе каля 50 хвілін.*

## Гуканьне Вясны

адбудзецца ў нядзелю **20 сакавіка 2011 году** апаўдні ў ***Ossining Boat and Canoe Club*** па адрасу:

***1 Westerly Road, Ossining, NY 10562*.**

*Даезд прыгарадным цягнікам з **Grand Central** у напрамку **Croton / Poughkeepsie** да прыпынку **Ossining** (45 min.) Побач са станцыяй парк на рацэ і будынак клюбу.*

*Пажадана, каб удзельнікі сьвята былі ў беларускіх строях, ці хаця б у сьветлых штанах / доўгіх спадніцах. Сьвята пачнецца з абрадавых карагодаў сярод лагодных краявідаў на Гудзоне, пазьней працягнецца ва ўтульным клюбе гарачым абедам.*

Квіткі **$10** дарослым, **$5** дзецям.

Арганізатары **Пятро і Лена Рыжыя** прасяць зьвязацца зь імі загадзя па тэл. ***(914) 522- 0742*** ці эл. пошту ***lenabelarus@yahoo.com***.

# У падтрымку палітвязьняў

***Заканчэньне з бачыны 1***

тым, што татальнае зьнішчэньне ўсяго беларускага ды свабоднага ў краіне прыводзіць да таго, што ўсё больш людзей выказваюць намер пакінуць Беларусь і зьяжджаюць з краіны. Асабліва гэта тычыцца моладзі. У такой сытуацыі, апынуўшыся далёка ад дому і сяброў, вельмі істотна даведацца пра тых, хто можа даць параду па, здавалася б, самых простых пытаньнях, якія аказваюцца складанымі для толькі прыбылых у новую краіну. Нават простыя словы падтрымкі могуць дапамагчы ў час, калі ўсё навокал падаецца чужым, а сваё гэтак далёка.

Прамоўцы коратка распавялі аб намаганьнях беларускіх арганізацыяў у Нью-Ёрку дапамагчы суайчыньнікам, якія робяць першыя крокі на амэрыканскім кантынэньце.

Цікавым для многіх было знаёмства, бадай, зь першым чалавекам, які быў на Плошчы-2010. Яго завуць Віталь, і ён коратка падзяліўся сваімі ўражаньнямі аб перажытым там.

Цягам акцыі ўдзельнікі скандавалі “Свабоду палітвязьням!” і “Жыве Беларусь!”.

Напрыканцы мітынгу ўсе разам ўжо традыцыйна прасьпявалі “Пагоню” ды “Магутны Божа”.

***Паводле belmov.org***

### Уплаты ў Нью-Ёрскі аддзел БАЗА

Складкі і ахвяраваньні:

| | |
|---|---|
| С. Асаёнак | 50 |
| А. Базевіч | 50 |
| Я. Бандарык | 50 |
| П. Бендаў | 50 |
| З. Габрусёў | 50 |
| Г. Гвазьдзеўская | 50 |
| Т. Грынчук | 50 |
| А. Захар’ева | 50 |
| Н. Карасьцелкіна | 50 |
| С. Крутаўцоў | 50 |
| Ю. Лісоўская | 50 |
| А. Міхайлоўская | 50 |
| Ю. Сямашка | 50 |

**Усім шчыры дзякуй!**

### Уплаты ў аддзел шліце на адрас:

*Belarusan American Association*
*P. O. Box 572*
*New York, NY 10113*

**Чэкі выпісвайце на** *Belarusan American Association.*

## НАСТУПНЫ СХОД

Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА адбудзецца **ў суботу, 12-га сакавіка 2011 г.** на Мангэтане.

Месца правядзеньня сходу:

***Seafarers and International House***
***123 East 15th Street***
***New York, NY 10003.***

*Даезд цягнікамі падземкі **L, N, Q, R, W, 4, 5, 6** да станцыі **Union Square**. Будынак знаходзіцца адзін блёк на ўсход ад Юніян-скўэр па 15-й вуліцы, на скрыжаваньні з Ірвінг-плэйс.*

Заля месьціцца на **2-м** паверсе.

Пачатак сходу: **а 6:00-й** вечара.

*Аб месцы і часе правядзеньня сходаў Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА ды іншых імпрэзаў, ладжаных аддзелам, можна даведацца, наведаўшы ўэбстаронку **www.baza-belarus.org***

### Ахвяравалі на выданьне бюлетэня *Весткі й Паведамленьні*:

| | |
|---|---|
| С. Асаёнак | 30 |
| П. Бендаў | 30 |
| А. Захар’ева | 30 |
| Н. Карасьцелкіна | 30 |
| С. Крутаўцоў | 30 |
| А. Міхайлоўская | 30 |
| Ю. Сямашка | 30 |

**Шчыры дзякуй!**

Усе ўплаты на ***“Весткі й Паведамленьні”***, пададзеныя ў папярэднім нумары, былі зробленыя ў памеры **$30**, а не $50, як было памылкова пададзена.

*Падпісацца на бюлетэнь могуць усе зацікаўленыя даслаўшы ў рэдакцыю аплату гадавой падпіскі ($30). Чэкі выпісвайце на **Belarusan American Association**.*

*Рэдакцыю бясплатна надрукуе прыватныя некамэрцыйныя абвесткі, а таксама будзе ўдзячная за дасланыя чытачамі і сябрамі водгукі й лісты.*

*Допісы ў рэдакцыю накіроўвайце на адрас:*

***VIESTKI***
***P. O. Box 3225***
***Farmingdale, NY 11735***

*альбо на адрас электроннай пошты:* ***viestki@mail.com***